# Камуніст

***Міхась Скобла***

Ня ведаю, як былі разьмеркаваныя 20 мільёнаў *камуністаў* па ўсім савецкім абшары, але на нашае заходнебеларускае мястэчка іх перапала амаль тры дзясяткі.

*Камуністамі*, альбо „парцейнымі", былі кіраўнікі ўсіх рангаў, пачынаючы ад школы і канчаючы калгаснай фэрмай. Нягледзячы на гэткую немалаважную акалічнасьць, бацькі пачасту асьцерагалі сваіх самастойных ужо дзяцей ад уступленьня ў партыю. Адна цётка замест матчынага блаславеньня параіла сыну апамятацца і ня лезьці ў сабачую скуру.

Калгасная сыстэма трымалася на прыгоне і крадзяжы, прычым апошні не лічыўся злачынствам. Сымбалічна, што сынонімам да слова „красьці" стаўся нэалягізм „*скамунізьдзіць*".

Надзвычайнай папулярнасьцю ў народзе ад часоў грамадзянскае вайны карысталася пагардлівае „*камуняка*".

Слова *камуніст*, ужытае ў назьве мастацкага твора, як бы сыгналіла наверх, што мастак — свой, служыць верай і праўдай і заслугоўвае афіцыйнага прызнаньня. І прызнавалі, як мастака Савіцкага, чыя карціна „*Пяюць камуністы*" мусіла сьцьвердзіць у вачох грамадзкасьці нязломнасьць і стойкасьць членаў *КПСС*.

Перад словам *камуніст* бездапаможна ніякавелі нават народныя паэты. Яно нівэлявала паэзію, ператварала твор у рыфмаваны лёзунг. Талент здаваўся ў палон ідэалёгіі. Школьнікі завучвалі на памяць верш Куляшова, разпораз спатыкаючыся на розных хібах: русізмах, няправільных канчатках альбо не ўласьцівых для беларускай мовы націсках:

> *Камуністы* — гэта слова, як са сталі...
> Маркс і Энгельс нам імя такое да́лі...

*Камуністы* зьбілі з тропу ня толькі паэтаў...

# Камуфляж

***Анатоль Вярцінскі***

Гэтае слова зь незвычайнай лёгкасьцю прыжылося на нашай беларускай глебе.

Чалавека з дубінкай і ў *камуфляжы* можна сёньня сустрэць на кожным рагу гарадзкой вуліцы, ды цяжка з прычыны *камуфляжу* зразумець, каго ці што ён беражэ і які парадак ахоўвае. І паколькі яго *камуфляжная* ўніформа вызначаецца ў залежнасьці ад канфігурацыі і афарбоўкі плямаў па-рознаму: „дзень — ноч", „лета — восень", „мыш — салома", то застаецца гадаць, што гэта азначае — ці то канец сьвета, ці то пачатак новага жыцьця, ці то яркі, як летні дзень, росквіт дэмакратыі, прытым такой, якой, як мы ня раз чулі, няма ў ніводнай самай дэмакратычнай краіне, ці то ае імглісты вечар, ае прыцемак, ці то неабходнасьць варушыцца, бегаць з мэтай выжываньня, накшталт мышы-палёўкі, ці то знак сядзець ціха пад мятлой, як мыш хатняя.

Здачу нацыянальнай дзяржаўнасьці можна *камуфляваць* гучнымі словамі